

ДЭЛЕГАТЫ ВІЦЕБШЧЫНЫ НА НАДЗВЫЧАЙНЫМ XII З'ЕЗДЗЕ СОВЕТАЎ БССР. НА ЗДЫМКУ (у першым радзе злева направа): тав. Казлоў Л. М. — ордэнаносец, токар дэпо станцыі Віцебск; тав. Еленскі—дыспетчар чыгуначнага вузла, ордэнаносец. У цэнтры работніца віцебскай махорачнай фабрыкі, узнагароджаная ордэнам «Знак почета» т. Лур'е Д. Б..

Фото С. Грына і В. Лейна (БСФ).

# ЦК КП(б)Б—тав. ГІКАЛО

Надзвычайны XII Усебеларускі З'езд Советаў шле гарачае большэвіцкае прывітанне баявому штабу соцыялістычнага будаўніцтва Совецкай Беларусі — ЦК КП(б)Б на чале з стойкім большэвіком, тав. Н. Ф. Гікало.

Народы Совецкай Беларусі разам з усімі народамі Совецкага Саюза з вялікай радасцю абмяркавалі і ўхвалілі праект сталінскай Канстытуцыі — закон соцыялістычнага грамадзтва, тварцом якога з'яўляецца наш мудры правадыр, наш бацька, наш настаўнік, вялікі геній чалавецтва Сталін.

Вялікая Кастрычніцкая соцыялістычная рэволюцыя, барацьба за правільнае правядзенне ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыкі, якую паслядоўна і няўхільна ажыццяўляла КП(б)Б, ператварылі Беларусь — былую калонію рускага царызма — у квітнеючую ордэнаносную рэспубліку, дзе народы нашы будуюць сваё радаснае і шчаслівае жыццё.

Беларускі народ ніколі не забудзе той вялікай дапамогі, якую яму аказаў рускі пролетарыят у барацьбе за вызваленне ад эканамічнага, палітычнага і нацыянальнага гнёту. Беларускі народ удзячны вялікаму Сталіну, мудраму арганізатару нашай барацьбы і тварцу беларускай дзяржаўнасці.

Перамогі ордэнаноснай БССР дасягнуты ў непрымірымай барацьбе з контррэволюцыйнымі нацдэмамі, разгромленымі КП(б)Б на чале з тав. Гікало, пад кіраўніцтвам ЦК ВКП(б) і тав. Сталіна.

У гэтай барацьбе выраслі людзі— сталінскія выхаванцы — партыйныя і непартыйныя большэвікі. Умацавалася і расшыралася совецкая дэмакратыя. Советы сталі магутнымі органамі пролетарскай дыктатуры, вернымі праваднікамі ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыкі.

Нас, усіх партыйных і непартыйных большэвікоў, рабочых, калгаснікаў, усіх працоўных Совецкай Беларусі, ЦК КП(б)Б і тав. Гікало выхавалі і згуртавалі ў духу беззаветнай адданасці нашай Партыі Леніна — Сталіна, нашаму горача любімаму таварышу Сталіну.

Мы памятаем, што жывем у капіталістычным акружэнні, што ёсць яшчэ асколкі недабітых ворагаў, у якіх звярыная нянавісць да краіны перамогшага соцыялізма. Тройчы прэзрэнныя забойцы з трацкісцка-зіноўеўскай тэрарыстычнай банды, ставячы сваёй задачай аднаўленне капіталізма ў нашай краіне, прабa-

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы